в XX веке и борьбы автора романа «Архипелаг ГУЛАГ» против тоталитаризмов XX века нам не научиться внутренней свободе и содержательности.

«Цель жизни человека не в счастье, а в том, чтобы за долгий жизненный путь духовно подняться, стать к смерти существом духовно более высоким, чем родился». Путь Александра Исаевича Солженицына в Большом Времени продолжается.

**Список литературы:**

1. Бердяев Н. А. Самопознание (Опыт философской автобиографии). М. Книга, 1991, стр.292.
2. Лотман Ю. М. Память в культурологическом освещении // Wiener Slawistischer Almanach, Bd, 16, 1985.
3. Солженицын А. И., Интервью журналу «Ле Пуэн» // Солженицын А.И. Публицистика. Т. 2. стр. 329.
4. Солженицын А. И., Бодался теленок с дубом. стр.126.
5. Солженицын А. И., Круглый стол в газете «Йомиури» // Солженицын А.И. Публицистика Т. 3. стр. 88.

**Бельскі А. І.**
(Мінск, Беларусь)

**УДК 821.161.1.09-31+929 Солженицын+821.161.3.09**

# АЛЯКСАНДР САЛЖАНІЦЫН І ТЭМА РЭПРЭСІЙ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ КАНЦА XX СТАГОДДЗЯ

***Ключавыя словы:*** *літаратура; рэпрэсіі; ахвяры; даваеннае мінулае; лагерная рэчаіснасць; калектывізацыя; В. Быкаў.*

***Анатацыя:*** *аўтар артыкула акцэнтуе ўвагу на асобе Аляксандра Салжаніцына як пачынальніка гулагаўскай тэмы, запыняецца на мастацкім увасабленні тэмы сталінскіх рэпрэсій у беларускай паэзіі і прозе. Значнае месца адведзена разгляду твораў антысталінскай накіраванасці В. Быкава, аналізуючца іх сюжэты і вобразы, аўтарская інтэрпрэтацыя падзей даваеннага мінулага.*

Пісьменнік Аляксандр Салжаніцын з дакументальнай праўдзівасцю, памастацку ўражальна, нават з ашаламляльнай псіхалагічнай пераканальнасцю распавёў свету пра сталінскія рэпрэсіі і лёс ахвяр палітычных рэпрэсій у СССР яшчэ ў савецкі час. Аднак праўда пра сталінізм з яго карнай сістэмай і лагерна-турэмным рэжымам стала шырокавядомай толькі на хвалі так званай «гарбачоўскай» перабудовы. Хаця развянчанне культу асобы Сталіна пачалося значна раней, у гады «хрушчоўскай адлігі». Салжаніцынскі «Архіпелаг ГУЛАГ» зрабіў сапраўдную рэвалюцыю ў свядомасці грамадства і народа, якія былі пазбаўлены праўды пра жахлівае сталінскае мінулае. Заслуга аўтара «Архіпелагу…» як мастака-грамадзяніна палягае ў тым, што ён сказаў суровую праўду пра тагачасную даваенную эпоху з яе атмасферай страху, даносаў, гвалту і катаванняў, паказаў трагічны лёс і нечалавечыя пакуты савецкіх вязняў ва ўмовах лагернай рэчаіснасці. Пісьменнік зрабіў значны ўплыў на актыўнае развіццё і асэнсаванне літаратуры антысталінскай, антытаталітарнай

накіраванасці. Безумоўна, трэба аддаць належнае і іншым аўтарам твораў пра ГУЛАГ (В. Шаламаў, Я. Гінзбург і інш.).

Пачатковы перыяд грамадскай перабудовы ў другой палове 1980-х гг. гэтак, як і абнаўленчы час пасля XX з’езда КПСС, зноў даў магчымасць тагачасным савецкім пісьменнікам, вязням сталінскіх лагераў, праўдзіва і сумленна выказацца пра зведанае ў сталінскіх засценках і ў лагернай няволі (А. Рыбакоў, Л. Разгон і інш.). Беларускія пісьменнікі — былыя катаржнікі, ахвяры культу асобы — у час перабудовы і першыя постсавецкія гады таксама выказаліся ў сваіх творах і кнігах на поўны голас. Менавіта тады пабачыла свет «спавядальная» паэзія і проза С. Грахоўскага («І радасць, і боль», 1988, «Споведзь», 1990), П. Пруднікава («Познія ягады», 1990, «За калючым дротам», 1993), Я. Бяганскай («Мая Галгофа», 1990), А. Звонака («Светлацені», 1992), В. Хомчанкі («Цар-зэк Сямён Івашкін», 1992), С. Новіка-Пеюна («Песні з-за кратаў», 1993), В. Супруна («Крык», 1993) і інш. Чытач атрымаў магчымасць пазнаёміцца з напісанымі раней «лагернымі» вершамі Л. Геніюш («Белы сон», 1990). У 1994 г. выйшла перавыданне антысталінскай кнігі аднаго з першых савецкіх вязняў Ф. Аляхновіча «У капцюрох ГПУ» [1], якая ўпершыню пабачыла свет яшчэ ў далёкім 1937 г. у Вільні. Гэтая дакументальная аповесць выйшла да канца 1930-х гг. на сямі еўрапейскіх мовах. Беларускі пісьменнік Ф. Аляхновіч задоўга да А. Салжаніцына і В. Шаламава паказаў гулагаўскую рэчаіснасць вачыма нявольніка-катаржаніна. Сярод твораў гулагаўскай тэматыкі вылучылася дзённікавая проза Б. Мікуліча. Яго «Аповесць для сябе» [8] пісалася ў 1946—1948 гг. паміж першым і другім арыштамі, тэкст твора доўгі час захоўваўся ў спецсховішчах і быў апублікаваны толькі ў 1987—1988 гг. Апрача іншага, «Аповесць для сябе» дае ўяўленне пра гулагаўскае жыццё і побыт, нявольніцкі лёс пакрыўджанага праз беззаконне і прымус чалавека. «Лагерная» літаратура складае асобную трагедыйную старонку. Кнігі беларускіх пісьменнікаў-пакутнікаў — паказ усёй абсурднасці і жахлівасці існавання ў атмасферы смяротнага страху і гвалту, іх канцэпцыя лёсу чалавека ва ўмовах жорсткага сталінскага часу падобная да праўдзівага сацыяльна-мастацкага дыягназу, зробленага А. Салжаніцыным і іншымі пісьменнікамі ў дакументальнай прозе на гулагаўскую тэму.

Памяць беларускіх паэтаў захавала ў дэталях рэалістычна-дакладныя карціны змрочнага лагернага жыцця і побыту. Вершаваныя радкі поўняць развярэджана-балючыя пачуцці незаслужана пакараных і несправядліва пакрыўджаных людзей. Адной з самых прыкметных кніг на тэму сталінскіх рэпрэсій стаў зборнік паэзіі А. Звонака «Светлацені» [6], адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі імя Янкі Купалы (1992). Матывы гаркоты, перажытага болю, асуджэння антычалавечнасці, выкрыцця пачварнага і звыродлівага складаюць эмацыянальна-пачуццёвае ядро гэтай кнігі (вершы «Спавядальнае», «Класавая барацьба», «Не вярнуцца мне на твой парог…», «Раманс» і інш.). Памяць пра даваенны час з яго страхам і гвалтам, як даводзіць А. Звонак у вершы «Літургія», патрэбна не толькі ахвярам сталінскіх рэпрэсій, але і для маральнай праўды і ачышчэння грамадства, для таго, каб падобнае не паўтарылася ў будучым.

Дэсталінізацыі свядомасці заклікаты быў паспрыяць выхад маштабнага шматтомнага выдання Л. Маракова пра рэпрэсіі ў Беларусі, дзе сабраны звесткі

пра шматлікіх ахвяр тагачаснага рэжыму: дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, творчай і навуковай інтэлігенцыі, святароў і працаўнікоў асветы. «Расстраляная літаратура» [10] — кніга-помнік беларускім пісьменнікам, якіх знішчылі карныя органы ў сталінскі час. Нацыянальную літаратуру напаткала вялікая трагедыя, была ўчынена расправа з маладымі талентамі, учарашнімі «дзецьмі рэвалюцыі», якія так шчыра паверылі ў савецкую ўладу, яе лозунгі і заклікі. У ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ноччу ў Мінску былі расстраляны больш як 20 беларускіх і яўрэйскіх літаратараў, і сярод іх М. Чарот, М. Зарэцкі, П. Галавач, А. Дудар, А. Вольны, В. Маракоў, Ю. Лявонны і інш. Л. Маракоў падлічыў асобасныя страты, прыводзіць такую жахлівую статыстыку: «...З 2000 рэпрэсаваных у СССР літаратараў каля 500 (чвэрць) прыходзіцца на Беларусь, колькасць насельніцтва якой складала ў час рэпрэсіяў у СССР менш за 5 працэнтаў» [7, с. 9]. Ён адзначае: «…у 30-я гады была знішчана духоўная моц, мозг нацыі» [7, с. 6]. Па сутнасці нашу нацыянальную літаратуру ў даваенны час напаткала катастрофа. Паэт М. Мятліцкі ў вершы «29 кастрычніка 1937 года» акурат і вяртае нас у чорны дзень беларускай гісторыі. Сталінскі рэжым бязлітасна знішчаў беларускія таленты, забіраў жыцці «дзяцей рэвалюцыі», і пра гэтую трагедыю «рэпрэсіраванай літаратуры» сучасны паэт гаворыць з горыччу і глыбокай засмучанасцю:

А ў кроне сасновай ірдзісты прамень
Свяціўся свавольна-вясёла.
І граў недалёка святочны дзень
Народзінаў камсамола.

Як камсамольскі лідар-трубач,
Самы для ўлад крамольны,
Першым упаў Платон Галавач,
Потым — Дудар,
Потым — Вольны… [9, с. 11]

Як адзначалася, тэма масавых рэпрэсій у савецкі час замоўчвалася і абміналася, аднак на хвалі «гарбачоўскай» перабудовы для пісьменнікаў з’явілася магчымасць раскрыць народную трагедыю ў 1930-я гг. В. Быкаў разглядаў гістарычны шлях беларускага народа як пакутніцкі і ахвярны. Вялікія людскія страты прыпалі не толькі на ваенны час, але і на гады сталіншчыны. В. Быкаў быў адным з першых літаратараў, хто прапанаваў праўдзівы і бескампрамісны аналіз савецкай гісторыі. Зрэшты, яшчэ ў «Знаку бяды» (1982) ён зрабіў смелы захад у паказе жыцця і лёсу беларускага сялянства ва ўмовах сталінскай калектывізацыі. У 1988 г., калі галоснасць паспрыяла выкрыццю сталінскіх злачынстваў, В. Быкаў гаварыў: «Урэшце прыйшоў час сказаць людзям праўду і зрабіць з яе пэўныя высновы. Найперш праўду трэба сказаць пра мільёны безыменных людзей Беларусі, рабочых, калгаснікаў, інтэлігентаў з народа, беларусаў, палякаў, яўрэяў, людзей іншых нацыянальнасцяў, панішчаных у гады сталіншчыны без віны, без права, без следу ў народнай памяці… Гэта патрэбна ў імя справядлівасці, у імя дэмакратыі, у імя нашай будучыні. У тым наш святы абавязак перад гісторыяй, маральны абавязак перад

наступнымі пакаленнямі, каб ім не давялося дакараць нас за тое, што мы мелі магчымасць і ўпусцілі яе» [5]. Пісьменнік скарыстаў спрыяльныя ўмовы і пашырыў адлюстраванне трагічных падзей даваеннага мінулага ў аповесцях «Аблава», «Сцюжа», апавяданнях «Жоўты пясочак», «Чырвоныя пятліцы» і інш. Так, В. Быкаў распачаў працу над «Сцюжай» у 1969 г., аднак дапісаў гэты твор да канца толькі ў 1991 г.

«Аблава» (1989) мае рэльную жыццёвую аснову. На гэты конт ёсць сведчанне самога пісьменніка: «У адну з апошніх маіх паездак на радзіму я прыдбаў ідэю-сюжэт аповесці “Аблава”. Знаёмы кубліцкі чалавек распавёў пра выпадак з 30-х гадоў, як у нас праходзіла калектывізацыя і з ёй — раскулачванне, высылкі, рэпрэсіі. Адзін селянін быў сасланы з сям’ёй пад Архангельск, там напакутаваўся, пахаваў жонку, малую дачку і вырашыў уцякаць на радзіму. Як ні дзіўна, тое яму ўдалося. Праз шмат прыгодаў-пакутаў, адолеўшы тысячу кіламетраў, ён апынуўся на родным котлішчы і соладка, на адзіноце паплакаў. Але на тым і скончылася ўсё яго шчасце вяртання. У дарозе яго ніхто не ведаў, а тут пазнаў першы ж сустрэты ранкам сусед. І ўжо надвячоркам на яго пачалі паляваць, наладзілі аблаву, у якой (во драма!) змушаны быў прыняць удзел і ягоны сын, што ў свой час адрокся ад бацькі і ўступіў у партыю. Бацька ўтапіўся ў балоце…» [2, с. 515—516]. Пакручасты, фатальна-трагічны лёс селяніна Хведара Роўбы ў аповесці «Аблава» развенчвае час «вялікага пералому», калі сталінская калектывізацыя бязлітасна руйнавала традыцыйны лад гаспадарання і жыцця, пракладала глыбокую мяжу паміж чалавекам і зямлёй, пазбаўляла беларускую вёску дбайных працаўнікоў. Па сутнасці гэта была неаб’яўленая вайна сялянству. Быкаўскі герой увасабляе тыповы лёс чалавека-працаўніка ў гады абвастрэння так званай класавай барацьбы. Як вядома, беларускае сялянства напаткала фізічнае вынішчэнне, гвалт, страх і прымус. В. Быкаў у «Аблаве» акцэнтуе ўвагу на злавесна-разбуральнай сутнасці часу і гаворыць пра катастрафізм духоўнага быцця ў цэлым: «Распадаліся сем’і, нішчылася людская роднасць, спрадвечная вясковая крэўнасць» [3, с. 394]. У выніку надточваліся асновы нацыянальнага светаўладкавання.

Родная вёска Хведара Роўбы мае сімваліка-абагульненую назву — Нядолішча. «Нялюдская доля» выпала беларускаму селяніну накшталт быкаўскага героя, бо на сваёй зямлі ён зрабіўся выгнаннікам. У чым жа бяда-нядоля гэтага немаладога чалавека, які нічога іншага не жадаў, як сумленна працаваць і жыць па-людску? «Пракляты лёс наканаваў яму ў такі час нарадзіцца селянінам» [3, с. 429], — прыходзіць да высновы пісьменнік разам са сваім героем, якога раскулачылі і выслалі на катаргу. Новая ўлада несправядліва і жорстка пакарала Хведара Роўбу, хаця яе ворагам ён не быў, наадварот, верыў, што «яна не пакрыўдзіць бедняка, яна галоўны клопат мае аб трудавым сялянстве» [3, с. 420]. Былы фальваркаўскі парабак як толькі выбіўся ў гаспадары, нажыў маёмасць, дык адразу зрабіўся адшчапенцам, «яго вылучылі з грамады, выбракавалі… і выкінулі далёка» ў Сібір. Хведар Роўба па сутнасці апынуўся ў пекле, дзе прайшоў праз пакуты і цяжкія выпрабаванні, знёс ганьбу і здзекі. У высылцы ён захаваў спрадвечную сялянскую цягавітасць: працуючы ў брыгадзе на лесасплаве, «на плытах ірваў жылы за

двух» [3, с. 398]. Напэўна, спадзяваўся, што будзе заўважана яго стараннасць і рупнасць. Магчыма, Хведар Роўба празмерна даверлівы і паслухмяны, але цяжка вінаваціць яго, як і большасць сялянства — бяспраўнага, прыгнечанага і запалоханага. Простаму селяніну цяжка было даўмецца, «за што яго пакаралі» і «завошта адабралі ўладай жа дадзеную зямлю» [3, с. 384]. Пазбаўлены ўсялякіх чалавечых правоў, быкаўскі герой-пакутнік трываў і выжываў у нявол як мог: «Ён не ўзрываўся, як некаторыя, калі, здавалася, трываць было неяк, не абураўся ад кепскіх харчоў, зверскай працы ці людской несправядлівасці…» [3, с. 402]. Ён, нібы Хрыстос, прымае суровы прысуд як наканаванне часу і лёсу, пакорліва і цярпліва нясе свой крыж. Неймаверна балючай стратай стала для яго смерць жонкі Ганулі і дачкі Волечкі, якіх вельмі любіў і пра якіх хваляваўся, шчыра клапаціўся. Аднак ён, хоць «нагледзеўся людской подласці ва ўсіх яе нечаканых праявах» [3, с. 398—399], не меў у душы азлобленасці, быў спагадлівы і ўдзячны за дабрыню. Прамая процілегласць Хведару Роўбу — яго зямляк Рагаўцоў, пра якога брыгадзір Кузняцоў кажа: «Гэны ўсё можа…» [3, с. 399]. Пасля сутычкі Рагаўцоў пагражае Хведару, што «возьме ў бліжэйшым пасёлку і “стукне”, і тады ягоная дачушка ўчуе яшчэ не такое на бліжэйшым этапе, куды яе запраторaць разам з яе чыстаплюем-бацькам» [3, с. 398]. Сярод спецперасяленцаў былі людзі розныя, сёй-той рабіўся жорсткім і бесчалавечным.

Хведар Роўба — чалавек, якога сілай адарвалі ад роднай зямлі, бацькоўскага кутка. Яму цяжка перажыць гэтае вымушанае расстанне, у думках ён пастаянна вяртаецца на радзіму. Усім сэрцам ён рвецца да вытокаў свайго жыцця, каб пабачыць мілыя сэрцу краявіды, аднавяскоўцаў, знаёмыя хаты і поле… У далёкім выгнанні яго Нядолішча робіцца прыцягальным, нібы рай: «Тут ужо ён не мог перайначыць сябе, ягоная натура насуперак усім абставінам імкнулася дамоў — праз безліч небяспек і нягод» [3, с. 402]. Уцёкі катаржніка з Котласа прадыктаваны жаданнем вырвацца з пякельнайursпасткі і па-чалавечы памерці «на радзіме ўсіх сваіх продкаў» [3, с. 379]. Аднак раю ў Нядолішчы ён не пабачыў, найперш кінуліся бядотнае тутэйшае жыццё і запусценне.

Ідучы дамоў, Хведар Роўба пазбягаў выпадковых сустрэч з людзьмі. Ён прадчувае небяспеку і магчымую расправу. Зрэшты, на сваім шляху ў родныя мясціны ён сустрэў людскую спагаду і чуласць. І ўсё ж уцякач робіцца асцярожным, палахлівым, яго апаноўвае страх. За многія тыдні свайго адзінокага блукання ён знямогся і, здаецца, адзічэў, невыпадкова гэтаму «адрынутаму Адысею» наканавана месца ў лесе, сярод звяроў: «Цяпер ён здань, начны, бесцялесны прывід, ад якога жахаюцца людзі, месца якому, мабыць, побач з ваўкамі ў лесе» [3, с. 404]. Пякуча-вострыя, пакутлівыя пытанні задае быкаўскі селянін напярэдадні жудаснай пагібелі, і выказаны яны нібы ад імя шматлікіх нявінных ахвяр сталінскага генацыду: «Божа мой, Божа, чаму мне выпала гэткая доля? Чаму я такі бядак? Хто ў мяне ўкраў шчасце і цяпер палюе за маім жыццём? Хіба я такі грэшны перад людзьмі і Богам? Каго я забіў, абабраў ці хоць зняважыў — каго?..» [3, с. 419]

Хведар Роўба схільны больш вінаваціць сябе, імкнецца зразумець іншых. Ён думае і хвалюецца пра сына Міколку, спрабуе знайсці апраўданне сыну, калі даведаўся, што той адступіўся ад бацькі-кулака і зрабіўся самаўладным, вельмі

жорсткім партыйным кіраўніком, які запалохвае сялян высылкай у Сібір: «Калі ён цяпер стаў такі, значыць, такім стаць было трэба. Асабліва калі ён не па сваёй злосці, а з дзяржаўнай патрэбы. Значыць, іначай нельга. А што выракся бацькі… Можа, ён адрокся таму, што бацька быццам памёр і ніколі не дазнаецца пра тое. Прынамсі, для яго, сына, сапраўды памёр, калі за шмат год ад таго — ні ліста, ні якой выпадковай весткі. Можа, так сыну лепей. Зноў жа — кулак!.. Мабыць, бацьку ўжо тым не нашкодзіць, а сын пажыве, можа» [3, с. 417]. У сэрцы быкаўскага героя балюча адгукаецца чалавечая бяздушнасць і чэрствасць, варожасць навакольнага свету. «Усё ў ім калацілася ад крыўды, ад прадчування хуткай бяды» [3, с. 426], — так пісьменнік перадае ўнутраны стан Роўбы, калі той становіцца сведкам арганізаванай на яго аблавы. Уцякач з далёкага Котласа апынуўся ў жахліва-безвыходнай сітуацыі: «Ён мог толькі бегчы, уцякаць, як звер. Але не як чалавек. Чалавек бы не ўцякаў ад людзей, ён бы нешта сказаў, і яго паслухалі б» [3, с. 426]. У гады сталіншчыны правілі баль ваўчыныя законы, людзі па сутнасці ператвараліся ў звяроў і з крыважэрнай хцівасцю палявалі адзін на аднаго. Загнаны, як воўк падчас аблогі, Хведар захлынуўся ў багне. У гэтым дзікім паляванні на бацьку ўдзельнічаў родны сын Мікола. На самагубства Роўба пайшоў свядома, ратуючы сваю чалавечую годнасць. Палохала думка пра тое, што пасля сыну «загадаюць… учыніць допыт над бацькам» [3, с. 431]. Пасля смерці жонкі і дачкі жыццё ўжо не мела для Хведара сэнсу, зрабілася невыносным, і ён з жахам прадчуваў, чым можа закончыцца гэтае адмысловае паляванне.

Час масавых рэпрэсій адлюстраваны ў апавяданні «Жоўты пясочак» (1995). В. Быкаў паказвае, як дзейнічала карная сталінская сістэма. А працавала яна бязлітасна, на поўную моц. Махавік рэпрэсій штодня падмінаў і закручваў усё новыя і новыя ахвяры. У савецкім грамадстве беспадстаўныя арышты і расстрэлы «ворагаў народа» спарадзілі атмасферу вялікага страху. Забойства людзей зрабілася звычайнай з’явай. Героі быкаўскага апавядання апынуліся «перад непазбежным канцом», перад тварам смерці — усе яны павінны скласці галовы ў магільнай яме: селянін-аднаасобнік Аўтух Казёл, пралетарскі паэт Фелікс Гром, рабочы-бальшавік Шастак, маскоўскі грабежнік Зайкоўскі, інтэлігент-буржуй Валяр’янаў, нядаўні следчы Сурвіла. У адной кагорце смяротнікаў гэтыя людзі апынуліся невыпадкова. Турмы ў савецкай краіне былі перапоўнены, рэпрэсіі набылі татальны характар. Карныя органы кідалі за краты людзей без разбору, хутка сваю справу вяршылі следства і суды, падводзячы «ворагаў народа» пад расстрэл. Здаралася, смяротныя прыгаворы выносіліся без судовага разгляду.

Кожны з шасцярых зняволеных «загрымеў» у турму па-свойму. Без віны вінаватыя селянін Аўтух Казёл, якога зрабілі «польскім шпіёнам», і паэт Фелікс Гром, аўтар «крамольных» вершаў, напісаных па-беларуску. Шосты арышт былога белагвардзейца Валяр’янава — вынік класавай пільнасці ў тагачасным грамадстве: «Ён ужо стаміўся апраўдвацца і на допытах збольшага маўчаў, прымаючы знявагі і пабоі як штосьці правамернае і заслужанае… Зрэшты, і чаго дачакаўся? Таго ж, што і брат. Толькі гадоў на пятнаццаць пазней» [4, с. 174, 192]. Бальшавік Шастак нібыта дзейнічае ў імя вялікай справы Леніна-Сталіна і мае спадзяванне, што «партыя ацэніць усё па справядлівасці» [4, с. 177]. На допыце

ён пагаджаецца «падпісаць паказанні аб шкодніцтве на чыгунцы», што насамрэч не адпавядае сапраўднасці, а ў турме-«амерыканцы» робіцца памагатым чэкістаў. У сталінскія часы не лічыліся ні з кім, распраўляліся нават з тымі, хто шчыра і з апантанасцю слугаваў рэжыму. Сурвіла, які нядаўна выбіваў прызнанні і сведчанні, «паказаў за паўгоддзе найлепшыя вынікі — 127 чалавек, падведзеных да вышэйшай меры» [4, с. 198], сам апынуўся ў ролі ахвяры і мусіць быць разам «з гэтымі шпіёнамі і шкоднікамі» [4, с. 168]. Зайкоўскі — крымінальнік, на яго рахунку больш дзесяці рабункаў. Усіх гэтых людзей зраўнаваў агульны лёс, і шлях іх пралягае «наперад, да свае смерці» [4, с. 189], дзе асуджаныя паўстаюць перад няўмольнасцю ка́та — памочніка каменданта Косцікава. Праўда, у нявольнікаў была магчымасць зрабіць спробу ўратавацца, калі машына, на якой іх везлі да месца расстрэлу, загразла ў глыбокай лужыне. Кожны з іх выдатна ведаў пра няўхільнасць смерці і, здавалася б, павінен быў рэальна ацаніць сітуацыю і скарыстаць апошні шанец, каб пазбегнуць расправы. Тым больш, што пры машыне з асуджанымі застаўся толькі чэкіст Косцікаў. У пэўны момант яго «турбавала іншае»: хаця б тыя не кінуліся на ўцёкі: «Ён моўчкі агледзеў у цемры змакрэлыя постаці асуджаных, нібы палічыў іх» [4, с. 185]. Але вязні страцілі ўсялякі інстынкт да самазахавання, адчуванне чалавечай годнасці. Яны паслухмяна выконваюць загады Косцікава, капошацца, быццам чарвякі, у раскаламучанай багне дарогі, высільваюцца і ледзь не вылузваюцца са скуры. Як гэта ні дзіўна, але не падпарадкоўваецца толькі грабежнік Зайкоўскі, які з пагардлівасцю падахвочвае небаракаў: «Піхайце, піхайце! Дружней піхайце, жалкія рабы сацыялізму!..» [4, с. 186]. Урэшце машыну выштурхнулі, непрадказальнага павароту ў лёсе вязняў не адбылося. Са здзекам Косцікаў выказвае падзяку за «ўдарную работу па ліквідацыі ЧП» [4, с. 191]. «Каб гэта залічылася…» [4, с. 191] — хвалюецца наіўны Шастак. Косцікаў цынічна-з’едліва гаворыць пра тое, якую ён заслужыў «ўзнагароду»: «Я вам прадастаўлю самую лепшую ямку. Сухую, з жоўтым пясочкам… Не горш, чым ударнікам сацыялістычнага спаборніцтва» [4, с. 191]. Смяротнікі не ў стане кінуць выклік лёсу, бо іх волю паралізаваў страх. Паводзіны герояў твора ёміста характарызуюць словы пісьменніка: «Свой катафалк яны ж самі і штурхалі да месца паховін» [4, с. 189]. В. Быкаў у раскрыцці псіхалогіі ахвяр і ка́та, іх узаемаадносін дасягае выразнай акрэсленасці і пераканальнай глыбіні.

Чэкіст Косцікаў — адзін са сталінскіх карнікаў, яго вобраз з’яўляецца яскравым увасабленнем тагачаснай рэпрэсіўнай сістэмы. Памкаменданта з пісталетам каля выкапаных магіл таксама нарошчвае тэмпы класавай барацьбы з «ворагамі народа». У яме апынуліся ўсе асуджаныя без выключэння, нягледзячы на тое, што хтосьці спадзяваўся на нейкі выратавальны цуд ці справядлівасць. Сталінскі кат бязлітасна знішчае людзей — і гэтую крывавую працу ён робіць штодня звыкла і дакладна: «Са сваімі беларускімі ворагамі Косцікаў не меў вялікага клопату, тыя заўсёды былі паслухмяныя і перад ямай паводзілі сябе як авечкі. Турма, доўгія месяцы допытаў ламалі іх канчаткова, і расстрэльваць такіх было нават нудна. Некаторыя, праўда (асабліва з ліку партыйцаў), перад смерцю крычалі: хай жыве Сталін, або камунізм, ці сусветная рэвалюцыя, мабыць, хітра разлічваючы тым на ягоную катаву

спагаду» [4, с. 204]. Над асуджанымі Косцікаў мае неабмежаваную ўладу, іх жыцці для яго нічога не значаць і не каштуюць. Ён паводзіў сябе бесцырымонна-груба, «заганяў чарговую кулю ў чарговую патыліцу» [4, с. 204] з безагляднай жорсткасцю, тым больш без шкадавання і пакут сумлення. Косцікаў, як гэта ні парадаксальна, быў вымушаны застрэліць свайго настаўніка Сурвілу — такога ж, як ён сам, адданага служку сістэмы. Калісьці той дзяліўся з маладым хлопцам, які пачынаў службу ў органах, сякім-такім досведам. Сурвіла, капаючы магільную яміну, папярэджвае, што чакае яго былога калегу-чэкіста: «Думаеш уцалееш? Службай адкупішся? Не! Прыйдзе і твая чарга…» [4, с. 207]. Гэтыя словы красамоўна сведчаць, што Косцікаў — толькі шрубка ў жахлівым механізме знішчэння людзей. Цалкам верагодна, што ў гэтую «мясарэзку» рана ці позна трапіць і ён сам, «вельмі проста дзе-небудзь апынецца і ягоная яма…» [4, с. 208]. Звярыныя інстынкты распальваў крывавы час сталінізму, спараджэннем якога і з'яўляюцца косцікавы. Пісьменнік усім трагедыйным зместам твора даводзіць, што «прымітыўны народ» пад гнётам страху і пакоры схільны да рабства, людаедства, самазнішчэння, не здольны супрацьстаяць ваяўнічаму злу і цемрашальству. Грамадству неабходна азірнуцца ў мінулае, каб вынесці адтуль павучальныя ўрокі, праверыць жыццёва важныя прынцыпы і выйсці на магістральны шлях чалавечай цывілізацыі з яе высокай гуманістычнай культурай.

Такім чынам, у дакументальна-мастацкіх кнігах і творах на гулагаўскую тэматыку другой паловы 1980-х — 1990-х гг. упершыню пасля «хрушчоўскай» адлігі ў нашай нацыянальнай літаратуры шырока адкрылася суровая праўда пра даваеннае савецкае мінулае, сталінізм, а менавіта пра стан у няволі ахвяр гвалту — фізічнага і маральна-псіхічнага, пакутны лёс чалавека ва ўмовах турэмна-лагернага зняволення. Творы В. Быкава «Аблава» і «Жоўты пясочак» сталі найбольш значным мастацкім дасягненнем беларускай прозы пра трагедыю беларускага народа ў перыяд сталінскай калектывізацыі і масавых рэпрэсій. Пісьменнік выйшаў на філасофска-аналітычнае асэнсаванне савецкай рэчаіснасці 1930-х гг., даў паглыблены экзістэнцыйна-псіхалагічны аналіз стану чалавека ў складаных, супярэчлівых абставінах даваеннага часу.

**Спіс літаратуры:**

1. Аляхновіч, Ф. У капцюрох ГПУ : аповесць / Ф. Аляхновіч. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 238 с.

2. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому: кн. успамінаў / В. Быкаў. – Мінск : ГА БТ «Кніга», 2003. – 539 с.

3. Быкаў, В. Збор твораў: у 6 т. / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1994. –Т. 5 : Кар'ер : раман; У тумане, Аблава : аповесці. – 432 с.

4. Быкаў, В. Сьцяна / В. Быкаў. – Менск : Наша ніва, 1997. – 382 с.

5. Васіль Быкаў = Василь Быков = Vasil Bykau [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.bykau.info›articles/by22/ – Дата доступу: 27.10.2018.

6. Звонак, А. Светлацені: вершы / А. Звонак. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 190 с.

7. Маракоў, Л. Вынішчэнне: Рэпрэсаваныя беларускія літаратары: даведнік / Л. Маракоў. – Мінск : Літ.-маст. фонд «Нёман», 2000. – 200 с.

8. Мікуліч, Б. Аповесць для сябе / Б. Мікуліч. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 236 с.

9. Мятліцкі, М. 29 кастрычніка 1937 года / М. Мятліцкі // Полымя. – 2010. – № 1. – С. 11–12.

10. Расстраляная літаратура : творы беларус. пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады / уклад. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі; прадм. А. Сідарэвіча. – Мінск : Кнігазбор, 2008. – 694 с.